*Спіс літаратуры*

*1. **Дзяржаўны** архіў Магілёўскай вобласці. – Фонд 1244. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 164–166, 168–174.*

*2. **Установа** «Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа». – КП 10755, КП 13514, КП 15164.*

*3. **Памятная** книжка Могилёвской губернии на 1906 год. – Могилёв : Губернская типография, 1906.*

*4. **Бурносаў** Васіль Емяльянавіч // Памяць : Гіст.-дакумент. хроніка Круглянскага р-на. – Мінск : БелЭн, 1996.*

*5. **Усікаў, Я. К.** Бурносаў Васіль / Я. К. Усікаў, А. С. Гурская // Беларускія пісьменнікі : біябібліягр. слоўнік : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1992. – Т. 1.*

*Юлія Амосава*

# ПОСТАЦЬ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА ПРАЗ АРХІЎНЫЯ І МУЗЕЙНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ Ў АДЛЮСТРАВАННІ ВІРТУАЛЬНАГА ПРАЕКТА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ «НА ХВАЛІ ЧАСУ, У ПЛЫНІ ЖЫЦЦЯ»

Калі чалавек сыходзіць з жыцця, памяць пра яго застаецца ў сэрцы родных і сяброў, усіх тых, хто сутыкаўся з ім, размаўляў, жартаваў, працаваў разам, паважаў і любіў. Ідзе час, паміраюць і тыя, хто ведаў гэтага чалавека, але памяць пра яго працягвае жыць у фотаздымках, дакументах, асабістых рэчах... Праз гэтыя прадметы можна скласці ўяўленне пра чалавека, чым ён жыў, што было значнае для яго. Мала таго, такія матэрыялы даюць магчымасць даследаваць асаблівасці жыцця і творчасці вядомых людзей, таленавітых творцаў, пісьменнікаў, мастакоў, навукоўцаў. Нацыянальная бібліятэка Беларусі актыўна вядзе працу па захаванні памяці значных для нашай нацыянальнай культуры людзей, папулярызуе іх спадчыну і дзейнасць. Найбольшую дасканаласць такая работа набывае пры супрацоўніцтве з іншымі ўстановамі культуры – архівамі і музеямі, якія з'яўляюцца скарбніцамі цікавых матэрыялаў, каштоўных для беларусаў.

Адным з найбольш маштабных праектаў, над якім цяпер вядзецца праца, – гэта віртуальны рэсурс «На хвалі часу, у плыні жыцця», прысвечаны 100-годдзю Усебеларускага літаратурнага аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк». Работа над ім ажыццяўляецца пры ўдзеле чатырох арганізацый – Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, а таксама Выдавецкага дома «Звязда» і часопіса «Маладосць». Праект складаецца з раздзелаў, прысвечаных юбілейным датам вядомых пісьменнікаў-маладнякоўцаў: Валерыя Маракова, Адама Бабарэкі, Уладзіміра Хадыкі, Уладзіміра Дубоўкі і інш. Дзякуючы музейным і архіўным матэрыялам кожны віртуальны раздзел яскрава раскрывае тую ці іншую асобу, дапамагае навукоўцам і даследчыкам у пошуках каштоўных дакументаў з дакладна выверанамі подпісамі.

У чэрвені быў прэзентаваны раздзел да 120-годдзя майстра беларускай прозы Кузьмы Чорнага. Сярод шматграннага матэрыяла ўвагу прыцягвае раздзел «Фотагалерэя», які дае магчымасць убачыць фатаграфіі пісьменніка, выявы яго дакументаў, перапіскі, асабістых рэчаў з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Літаратурнага музея Кузьмы Чорнага, што знаходзіцца на радзіме пісьменніка ў Цімкавічах. Увесь гэты матэрыял набліжае асобу К. Чорнага да нас, робіць яго постаць не «забранзавелай», а жывой і падобнай да кожнага звычайнага чалавека з яго адчуваннямі і пакутамі, каханнем і момантамі шчасця, штодзённымі клопатамі і выключнымі падзеямі. Бо лёс Кузьмы Чорнага нічым не адрозніваецца ад жыцця нашых продкаў, сучаснікаў пісьменніка, што перажылі Першую сусветную вайну, рэвалюцыйныя пераўтварэнні, былі рэпрэсаваныя...

Для лепшага ўспрымання мы падзялілі фотаздымкі на некалькі падраздзелаў: гэта фота з сям'ёй, фотаздымкі з калегамі і сябрамі, рукапісы, лісты і рэчы Кузьмы Чорнага.

Фота з сямейнага альбома прадстаўляюць пісьменніка і яго родных у розныя гады жыцця. Так, на здымках можна ўбачыць сястру празаіка Ганну Карлаўну Раманоўскую (у замужжы Высоцкую), першую жонку К. Чорнага паэтку Іду Чырвань, якая стаіць побач з мужам, яго малодшымі сёстрамі і братам, другую жонку пісьменніка Рэвеку Свераноўскую і іх дачку Рагнеду, якую ў жыцці звычайна называлі Ірай. Прыцягваюць увагу некалькі архіўных фотаздымкаў 1925 г. і фота 1927 г., што былі зробленыя ў пачатку творчага шляху Кузьмы Чорнага. Нягледзячы на малады ўзрост, у гэты час ён ужо быў аўтарам зборнікаў «Апавяданні» і «Срэбра жыцця» з серыі «Кніжніца Маладняка», а літаратурныя крытыкі, звярнуўшы ўвагу на маладога творцу, ужо ў 1920-я гг. назвалі яго «беларускім Дастаеўскім». Партрэт Кузьмы Чорнага 1926 г. апісаў драматург Віталь Вольскі: «Гэта быў спакойны, удумлівы малады чалавек з поўным белым тварам, высокім ілбом і хвалістымі валасамі льнянога колеру. Павольны ў рухах, знешне нават крыху флегматычны, ён ніколі не спяшаўся. Сталы і разважлівы не па ўзросце, поўны і прысадзісты з постаці, ён здаваўся старэйшым за свае гады» [2, с. 31].

Архіўныя фотаздымкі даюць магчымасць прасачыць, як апранаўся пісьменнік. Так, на фота 1920-х і аж да пачатку 1940-х гг. бачна, што ён аддаваў перавагу класічнаму стылю, часцей за ўсё на ім касцюм, гальштук, чорнае паліто, што сёння захоўваецца ў Літаратурным музеі пісьменніка ў Цімкавічах. Вядомы беларускі скульптар і сябар празаіка Заір Азгур наконт гэтага ўспамінаў: «Апранаўся Кузьма Чорны заўсёды вельмі сціпла, каб не вылучацца сярод іншых. Стараўся быць непрыкметным. Аднак яго вялікі лоб, над якім кучаравіліся светлыя валасы, яго прамяністыя шэрыя вочы сведчылі, што гэта чалавек з незвычайнай душой» [1, с. 79].

Асобна размешчаны ў праекце групавыя фотаздымкі Кузьмы Чорнага з пісьменнікамі, удзельнікамі «Маладняка» і «Узвышша», сябрамі і калегамі: Адамам Бабарэкам, Кандратам Крапівой і інш. Сярод здымкаў ёсць фота К. Чорнага з паэтам і таленавітым перакладчыкам Юркам (Юрыем Паўлавічам) Гаўруком, які пасля смерці сябра прысвяціў яму кранальны верш «Памяці Кузьмы Чорнага» (1945). Цікава, што па групавых фотаздымках можна

прасачыць жыццё не толькі адной асобы, але і храналогію знакавых падзей з гісторыі беларускай літаратуры. Напрыклад, у праекце прадстаўлена архіўная фатаграфія беларускіх пісьменнікаў з вядомым латышскім паэтам Янам Райнісам, сустрэча з якім адбылася ў Мінску 19 лістапада 1926 г. Са здымка на нас глядзяць маладыя літаратары: Змітрок Бядуля, Кандрат Крапіва, Язэп Пушча, Адам Бабарэка, Уладзімір Дубоўка, Пятро Глебка і Кузьма Чорны, а ў цэнтры сядзяць Ян Райніс і Янка Купала. Пра гэты памятны дзень Кандрат Крапіва пісаў: «Сустрэча была не доўгай, але сардэчнай. На заканчэнне гэтага вечара з'явіўся ўсім вядомы фотаздымак. Яніс і Янка Купала як быццам сімвалізуюць літаратурную дружбу двух братніх народаў, а мы, маладое пакаленне беларускіх літаратараў, з'яўляемся працягам слаўных традыцый народных пісьменнікаў...» [5].

Сярод ужо вядомых, хрэстаматыйных фатаграфій, вылучаюцца тыя, якія нячаста публікаваліся, напрыклад, фота Кузьмы Чорнага з калектывам газеты «Звязда», датаванае вераснем 1941 г. Фотаздымак захоўваўся ў архіве Марыі Хайноўскай, якая пасля вайны працавала загадчыцай бібліятэкі Саюза пісьменнікаў, сёння ж фота знаходзіцца ў фондах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Кузьма Чорны быў знаёмы з Марыяй Канстанцінаўнай, ведаў яе як супрацоўніцу Дома пісьменнікаў, нават узгадваў яе ў сваім дзённіку ад 8 жніўня 1944 г., калі ўжо знаходзіўся ў эвакуацыі: *«Прыязджала з Менска Хайноўская. Яна асталася такая ж мілая, разумная і практычная ў самым найлепшым сэнсе. Усё ўмее і можа зрабіць і ўсё ацаніць праўдзіва»* [6].

У праекце размешчаны два фотаздымкі Кузьмы Чорнага з калектывам газеты «Савецкая Беларусь» 1942 г. з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Фота зроблена ў Маскве, дзе пісьменнік знаходзіўся ў эвакуацыі да 1944 г., удзельнічаў у выданні газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». За гэты час ім было напісана каля паўсотні артыкулаў і фельетонаў, зборнік апавяданняў «Вялікае сэрца» (1945), тры раманы – «Вялікі дзень» (1941–1944), «Пошукі будучыні» (1943) і «Млечны шлях» (1944).

Дзякуючы супрацоўніцтву бібліятэкі з Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва атрымалася ўключыць у рэсурс копіі рукапісаў твораў Кузьмы Чорнага, машынапісныя матэрыялы і арыгінальныя лісты пісьменніка да родных і сяброў. Вылучаецца ліст 1940 г. да перакладчыка і літаратуразнаўца Яўгена Мазалькова, якога Кузьма Чорны запрашаў да сябе ў госці ў Мінск: *«Только уж не думайте о гостинице. У меня теперь в квартире свободно, у меня всегда будет для Вас комната и самая искренняя дружеская атмосфера в ней, и даже вид из окна на далекий лес и поле. Приезжайте»* [4, с. 478]. Пры гэтым асобныя фразы, якія К. Чорны палічыў найбольш важнымі – асабліва наконт гасцініцы і пакоя – падкрэслены пісьменнікам, а ніжэй напісаны яго хатні адрас. Такія звесткі дазваляюць зірнуць на празаіка як на чулага, душэўнага і простага ў зносінах чалавека. Мала таго, у лісце пісьменнік згадвае, што ён *«оторван от работы театром: репетируют мою пьесу и предложили мне сделать некоторые переделки»*. Мяркуючы па тым, што ліст напісаны 22 лістапада 1940 г., рэпетавалі п'есу «Ірынка», якая ў пачатку 1941 г. з'явілася на сцэне Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Якуба Коласа ў пастаноўцы Цімафея Сяргейчыка. Таксама можна пазнаёміцца

з чатырма лістамі Кузьмы Чорнага да празаіка, крытыка і драматурга Іларыёна Барашкі, датаванымі 1941 і 1942 г. У адным з лістоў пісьменнік дзеліцца сваімі назіраннямі пра прэм'еру «Ірынкі», параўноўвае віцебскую і мінскую пастаноўкі, а ў папярэднім лісце К. Чорны піша пра зацікаўленасць многіх расійскіх тэатраў перакладамі яго п'ес на рускую мову. Так, вядома, што ў Маскве ў пачатку 1940-х гг. у тэатральным асяродку добра памяталі паспяховую пастаноўку п'есы «Бацькаўшчына» К. Чорнага, здзейсненую ў 1933 г. падчас гастроляў БДТ-1, таму і захапіліся ідэяй перакладу твораў пісьменніка, што сведчыць не толькі пра высокі узровень яго драматургічнага майстэрства, але і пра яскравае сцэнічнае ўвасабленне яго твораў беларускімі акцёрамі.

Для даследчыкаў будуць карысныя дакументы Кузьмы Чорнага з фондаў архіва-музея. У праекце, акрамя вядомай анкеты пісьменніка як удзельніка першага маладнякоўскага з'езду, можна ўбачыць ліст-заяву К. Чорнага ў Дзяржаўнае выдавецтва БССР ад 4 снежня 1933 г. з тэкстам: *«Обязуюсь в течение 1934 года дать Белгизд детскую книжку»*. Гэты дакумент падкрэслівае цікавасць пісьменніка да стварэння літаратуры для дзяцей, што пацвярджаецца аповесцю «Насцечка», апавяданнем «Як дзядзька Тамаш напалохаў ваўкоў» і шэрагам іншых твораў.

У падраздзеле «Фотагалерэя» можна асобна пазнаёміцца з лістамі Кузьмы Чорнага да сябра – пісьменніка і літаратурнага крытыка Адама Бабарэкі. Гэтая эпісталярная спадчына, якую складаюць сем лістоў, з'яўляецца часткай асабістага фонду А. Бабарэкі і яго сям'і, што сёння захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Вядома, што летам 1930 г., у сувязі з арыштам і высылкай А. Бабарэкі, сябры развіталіся назаўсёды, перапіска ва ўмовах таго часу была немагчымай, не ўсё захавалася да нашых дзён, але сёння гэтыя сем лістоў з'яўляюцца найкаштоўнейшай крыніцай для вывучэння жыцця і творчасці К. Чорнага [3, с. 466].

Такім чынам, звяртаючыся да творчасці Кузьмы Чорнага, вельмі важным з'яўляецца мець уяўленне пра яго як пра чалавека, вызначыць асаблівасці яго жыцця, характар зносін з людзьмі, бо гэта дазваляе лепш зразумець творчасць пісьменніка, убачыць прататыпы тых блізкіх ці знаёмых яму людзей, якія сталі героямі яго раманаў і аповесцей. З дапамогай матэрыялаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, якія прадстаўлены грамадскасці на старонках віртуальнага праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця», сёння можна раскрываць нешта новае і раней невядомае пра тых дзеячаў, вядомых нам яшчэ са школьных падручнікаў, зірнуць на іх як на простых, звычайных людзей, якімі былі і нашыя продкі, а гэта падаецца вельмі цікавым і неабходным для разумення творчай спадчыны беларускіх пісьменнікаў.

*Спіс літаратуры*

1. **Азгур, З.** *«Пра людзей, якім я ўдзячны» / З. Азгур // Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет : успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы / [уклад. Г. Шаблінская]. – Мінск : Маст. літ., 2016. – 510 с., іл., партр., факсім. : партр.*

2. **Вольскі, В.** *Нататкі да біяграфіі Кузьмы Чорнага / В. Вольскі // Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет: успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы / [уклад. Г. Шаблінская]. – Мінск : Маст. літ., 2016. – 510 с., іл., партр., факсім. : партр.*

*3. **Запартыка, Г.** Постаць Кузьмы Чорнага ў дакументах архіўнага фонду Адама Бабарэкі / Г. Запартыка // Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет : успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы / [уклад. Г. Шаблінская]. – Мінск : Маст. літ., 2016. – 510 с., іл., партр., факсім. : партр.*

*4. **Ліст** Кузьмы Чорнага да Яўгена Мазалькова / К. Чорны // Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет : успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы / [уклад. Г. Шаблінская]. – Мінск : Маст. літ., 2016. – 510 с., іл., партр., факсім. : партр.*

*5. **Філіповіч, Д.** «Вечна жыць вам, Купала і Райніс...» [Электронны рэсурс] / Д. Філіповіч // Pawet. – 2005. – 28 вер., № 37 (723). – Рэжым доступу: http://pawet.net/ns/2005/37/%E2%84%96_37_(723).html. – Дата доступу: 25.09.2020.*

*6. **Чорны, К.** Дзённік [Электронны рэсурс] / К. Чорны // Беларуская палічка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Kuzma_Corny/Dzionnik.html. – Дата доступу: 25.09.2020.*

*В'ячеслав Левицький*

# ЗАДУМИ СЦЕНАРІЇВ ДЛЯ КИЇВСЬКОЇ КІНОСТУДІЇ В ХУДОЖНЬОМУ СВІТІ ВОЛОДИМИРА КОРОТКЕВИЧА

У листі до О. Білецького від 07.07.1956 В. Короткевич писав: *«Уезжал из Киева в отвратительнейшем настроении, хуже уже некуда было. <...> Таким далёким представляется Киев <...>, так и казалось, что всё обрезано, что зачеркнул семь лет жизни и что вместе со всем этим уходит и юность»* [7, арк. 6].

Одначе в подальшому молодий білоруський письменник намагався утримати творчі зв'язки зі столицею України. Серед іншого, на початку 1960-х рр. він спробував налагодити співпрацю з Київською кіностудією ім. О. Довженка. Понад те, ідеться про намір утілити ще студентську мрію про роботу над художнім фільмом. Саме такі висновки окреслюються в ході опрацювання кількох документів, що зберігаються в Центральному державному архіві-музеї літератури та мистецтва України (ЦДАМЛМ України) й залишаються неопублікованими дотепер.

Мета запропонованого дослідження – проаналізувати в ракурсі текстології, у тому числі із залученням інтертекстологічних прочитань, матеріали щодо задумів кінодраматичних творів В. Короткевича з огляду на змістові домінанти іншого його доробку.

Уперше про російськомовні заявки білоруського автора на сценарії повнометражних художніх фільмів «Батальйон жовторотих» («Батальон желторотых»), «Місто біля краю веселки» («Город у края радуги», обидва – 1962), а також його лібрето літературного сценарію повнометражного художнього фільму «Журналісти» («Журналисты», 1953; співавтор – О. Самойленко) стало відомо завдяки публікації О. Литвинової 2017 р. [8][1].

Фонди ЦДАМЛМ України засвідчують, що активність Короткевича-кінодраматурга розпочинається не 1960 р., коли він вступає на дворічні Вищі сценарні курси в Москві, і здобуває найраннішу репрезентацію не в сценарії за «Легендою про бідного диявола й адвокатів сатани» («Легенда аб бедным

[1] Автор дослідження висловлює щиру вдячність О. Литвиновій за уточнення інформації про реквізити відповідних архівних справ із творами В. Короткевича.